2. *Бодрийяр, Ж.* Симулякры и симуляция / Ж. Бодрийяр ; под ред. А. Р. Усмановой // Философия эпохи постмодерна : сб. переводов. – Минск : Красико-принт, 1996. – С. 32–47.

# КОМПЛЕКС МУЗЕЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЫЛОГА БЕРНАРДЗІНСКАГА КЛЯШТАРА Ў МІНСКУ: ВОПЫТ СТВАРЭННЯ ЭКСПАЗІЦЫІ

***Ю. В. Кавалёва,***
*аспірант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Артыкул прысвечаны актуальным пытанням сучаснага стану музеязнаўства, у прыватнасці музеефікацыі нерухомых аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ва ўмовах горада. Разглядаецца дзейнасць Музея гісторыі горада Мінска па музеефікацыі і актуалізацыі аб'ектаў Верхняга горада.

З 2014 г. у структуры Музея працуюць экспазіцыі на тэрыторыі былога кляштара бернардзінцаў: «Карэтная», Археалагічны музей. У 2017 г. адкрыта экспазіцыя «Мінская конная чыгунка». Месцазнаходжанне экспазіцый на абмежаванай тэрыторыі, аб'яднанай агульным гістарычным мінулым, па сутнасці фарміруе музеефікаваную зону як асаблівы элемент функцыянальна-прасторавай структуры гістарычнага горада.

Пытанні неабходнасці вызначэння межаў музеефікаванага аб'екта і музейных зон, тэарытычныя аспекты музеефікацыі гарадскога асяроддзя разглядаюцца ў даследаваннях М. Е. Каўлен, Л. П. Лаўрова, А. М. Масцяніцы, Макса Хебдзіча і інш. Большасць даследчыкаў, разглядаючы характэрныя рысы сучаснага стану музейнай справы, схіляюцца да максімальнага пашырэння межаў музеефікацыі – ад адзінкавых нерухомых помнікаў да значных тэрыторый, да захавання элементаў ладу жыцця, традыцый і г. д. Комплекс музеяў на тэрыторыі былога бернардзінскага кляштара ў Мінску у многім адпавядае сучасным падыходам да музеефікацыі гарадскога асяроддзя.

Мінскі кляштар бернардзінцаў размяшчаўся ў межах гістарычнай забудовы Верхняга горада, які абмяжоўваецца сучас-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нымі плошчай Свабоды, вуліцамі Кірылы і Мяфодзія, Зыбіцкай (былая Гандлёвая) і Герцэна. Ён быў заснаваны Краснасельскім старостам А. Кянсоўскім у 1624 г., які разам з жонкай Гальшкай з роду Ляўковіч перадаў бернардзінцам вялікі драўляны дом на Высокім рынку. У 1625 г. гэта ахвяраванне было зацверджана вялікім князем Літоўскім Жыгімонтам III. Тады ж перададзены бернардзінцам і дадатковыя зямельныя ўчасткі. У 1630-я гг. намаганнямі Яна, сына А. Кянсоўскага, драўляны дом перабудаваны пад жылы манаскі корпус, у 1638 г. пабудаваны драўляны касцёл Святога Язэпа (Юзафа).

У 1644 г. пасля пажару віленскі біскуп ухваліў рашэнне адбудаваць бернардзінскі кляштар. Былі ўзведзены мураваныя жылы корпус і касцёл. На працягу XVII–XVIII стст. комплекс не аднойчы перабудоўваўся і рамантаваўся [1].

На кляштарных могілках былі пахаваны прадстаўнікі вядомых шляхецкіх і магнацкіх родаў: Завішаў, Кянсоўскіх, Тышкевічаў, Хмараў і інш.

У XVIII ст. пры кляштары існавала школа філасофіі. У 1819 г. заснавана пачатковая школа з навучаннем па сістэме Бела – Ланкастэра. У 1830 г. у кляштарнай школе філасофіі было 13 манахаў і 12 клірыкаў. У 1864 г. кляштар зачынены і пераабсталяваны пад турму, у якой утрымліваліся ўдзельнікі паўстання 1863–1864 гг. Пазней будынкі кляштара перададзены розным ведамствам. Касцёл у 1872 г. прыстасаваны пад архіў, з 1992 г. у ім знаходзіцца Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі і Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.

Комплекс кляштара акрамя касцёла і жылога корпуса ўключаў каменныя і драўляныя гаспадарчыя будынкі (свіран, лядоўню, стайні і інш.). Падчас яго рэканструкцыі ў 2007–2012 гг. збудаваны новы будынак агульнай плошчай 72,0 м$^2$ для размяшчэння музейнай экспазіцыі «Карэтная». У аснове архітэктурнага праекта – праекціровачныя чарцяжы канца XIX ст.

Экспазіцыя «Карэтная» прысвечана гісторыі коннага транспарту жыхароў Мінска губернскага перыяду (канец XVIII – пачатак XX ст.). Прадстаўлены арыгінальныя асноўныя тыпы і віды сродкаў перамяшчэння мінчан. Дэманструюцца тры віды

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гужавога транспарту: карэтны (лёгкая каляска тыпу фаэтон), калёсны (драбяк, брычка) і палазны (сані, вазкі).

Паводле плана 1806 г. Мінскі бернардзінскі кляштар уключаў вазоўню са стайнямі. У інвентары за 1820-я гг. апісваецца размяшчэнне і вонкавы выгляд вазоўні – гэта было збудаванне прамавугольнай формы з дрэва і цэглы [2]. Двайныя і адзінарныя дзверы ў будынку манціраваліся з дапамогай завес і гакаў і зачыняліся жалезнымі зашчэпкамі. Размяшчалася вазоўня на перасячэнні сучасных вуліц Зыбіцкай і Кірыла і Мяфодзія.

У вазоўні захоўваліся сані і звычайныя вазы, на якіх манахі перавозілі груз, экіпажы ігуменаў храма або гасцей, якія знайшлі прытулак у кляштары.

У 1870-х гг. частка будынкаў бернардзінскага кляштара перададзена пажарнаму дэпо. Будынак вазоўні выкарыстоўваўся як стайня.

У 1920–1930-х гг. на месцы састарэлай ад часу стайні ўзвялі мураваны будынак, які функцыянаваў як складское памяшканне.

Археалагічны музей уведзены ў эксплуатацыю ў канцы 2014 г., пастаянная экспазіцыя на дадзеным этапе станаўлення музея адсутнічае. Ва ўнутранай прасторы будынка музея здзейснена музеефікацыя нерухомага археалагічнага аб’екта, які быў выяўлены падчас раскопак 2007 г. Знаходка прадстаўляе сабой каменныя падмуркі будынка, якія адлюстроўваюць адзін з этапаў добраўпарадкавання кляштара – фрагмент сцяны Г-абразнай формы. Падмуркі выкладзены з цэглы памерамі 26,4х13,2х6,8 см. Даўжыня паўночна-заходняй сцяны – 13,6 м, вышыня – 1,2–1,6 м, таўшчыня 0,58–0,62 м. Сцяна складаецца з трох арак, якія абапіраюцца на слупы. Даўжыня пралётаў арак – 3,6–3,8 м. Паводле стратыграфічных дадзеных, цагляны падмурак быў узведзены ў пачатку XVIII ст. На планах манастыра XVIII–XIX стст. пабудова не пазначана, магчыма, не была завершана. Пра гэта сведчыць шэраг канструктыўных недапрацовак: адсутнасць звязак паміж сценамі, парушэнне прапорцый паміж паўночна-ўсходняй і паўночна-заходняй сценамі, адсутнасць апорнага слупа пад арачнае перакрыццё і інш.

На дадзеным этапе распрацавана навуковая канцэпцыя пастаяннай экспазіцыі Археалагічнага музея Мінска, будынак



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстоўваецца пад часовыя экспазіцыі, сярод якіх неабходна вылучыць доўгатэрміновы культурна-адукацыйны праект «Па слядах маманта». Праект складаецца з выстаўкі палеанталогіі, відэазоны, адукацыйнай гульнявой праграмы. За апошнія дзесяцігоддзі ўпершыню ў Мінску рэалізаваны такі маштабны праект, які адлюстроўвае гісторыю палеанталагічных даследаванняў тэрыторыі горада. У арганізацыі выстаўкі прымалі ўдзел Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Геалагічны музей Навукова-вытворчага цэнтра па геалогіі.

У сакавіку 2017 г. адкрылася трэцяя экспазіцыя з комплексу – «Мінская конная чыгунка». Будынак, дзе размешчана экспазіцыя, у канцы XIX – пачатку XX ст. выкарыстоўваўся пажарнай камандай. У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі захаваліся чарцяжы, планы, фасады і разрэзы будынкаў пажарнага дэпо.

У інвентары Мінскай гарадской пажарнай каманды за 1899 г. паведамляецца, што «... каменное одноэтажное здание пожарного депо покрыто железом» [2].

Размяшчэнне ў дадзеным будынку экспазіцыі, прысвечанай першаму грамадскаму транспарту Мінска – коннай чыгунцы – невыпадковае. Самая доўгая Цэнтральная лінія Мінскай конкі праходзіла ўздоўж вуліцы Кірыла і Мяфодзія, на якую скіраваны галоўны фасад будынка. У дадзеным выпадку месцапалажэнне экспазіцыі напрамую звязана з гарадскім асяроддзем.

Пра жыццё Мінска 1890–1920-х гг. можна даведацца з раздзела экспазіцыі «Па вуліцах губернскага Мінска», дзе цэнтральным экспанатам з’яўляецца рэканструкцыя коннага вагона ў маштабе 1:1. Наведвальнік можа зайсці ў вагон і здзейсніць віртуальную паездку па Саборнай плошчы (сучасная плошча Свабоды).

У памяшканні музея створаны экстэр’ер мінскай вуліцы з вітрынамі самых папулярных магазінаў XIX–XX стст., уздоўж якіх праходзіла лінія конкі.

У раздзеле «Упраўленне Мінскай коннай чыгункі» прадстаўлены фрагмент інтэр’ера канторы, які адноўлены паводле «Вопісаў рухомай маёмасці 1913 года».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, Музей гісторыі горада Мінска развіваецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі сучаснага грамадства і актуальнымі тэндэнцыямі ў музеялогіі. Дзейнасць па музеефікацыі аб'ектаў Верхняга горада накіравана на ўсебаковае вывучэнне гісторыі музеефікаваных аб'ектаў з мэтай наступнага стварэння адпаведных экспазіцый і распрацоўкі культурна-асветніцкіх праграм, накіраваных на актуалізацыю гісторыка-культурнай спадчыны горада Мінска.

---


1. *Дзянісаў, А. М.* Мінскі кляштар бернардзінцаў / А. М. Дзянісаў // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – С. 209.

2. Минская городская управа // Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). – Фонд 1. Оп. 1. Л. 5.


## ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ СУЧАСНЫХ ФОРМ СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ


***А. Я. Камінскі,***

*дацэнт, загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят*

*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*


У адпаведнасці з «Тэматычным планам навукова-даследчых работ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў на 2016–2020 гг.» на кафедры рэжысуры абрадаў і свят вядзецца тэарэтычная распрацоўка праблемы тыпалогіі мастацкіх форм гарадской святочнай культуры. Супрацоўнікі кафедры арыентуюцца на вывучэнне цэлага спектру праблем, звязаных з гістарыяграфіяй, акрэсленнем традыцый народнага мастацтва ў кантэксце сучаснай святочнай культуры, апісаннем спецыфікі абрадавых і тэатралізаваных форм.

Канцэптуальнае асэнсаванне гарадской святочнай культуры Беларусі з улікам гістарычнага кантэксту і дынамікі змяненняў яе традыцый і мастацкіх форм з'яўляецца надзвычай актуальным, бо ў сучаснай навуцы гэты сегмент народнай культуры асэнсаваны пакуль толькі ў асобных аспектах. Працэсы глабалізацыі, што імкліва нарастаюць у свеце ў XX – пачатку XXI ст.,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ